

teksomolika

GP

gpress.info

# ДАЙДЖЭСТ

## АСВЯТЛЕННЯ ТЭМАТЫКІ ЛГБТК+ У БЕЛАРУСКІХ МЕДЫЯ

*Ліпень–верасень 2022 года*

Трэці квартал 2022 года адзначыўся інфармацыйнай насычанасцю ЛГБТК+ тэматыкі ў беларускіх медыя.

Зацішша папярэдніх трох месяцаў з лішкам кампенсуюць цяперашнія зафіксаваныя намі нападкі на квір-людзей, якія выдаюцца за «барацьбу за традыцыйныя каштоўнасці».

Прапаганда, ужо не саромеючыся, ставіць знак роўнасці паміж краінамі ЕС і ЛГБТК+, а адсюль праводзіць ілжывыя аналогіі і нічым не падмацаваныя сэнтэнцыі пра разбэшчанне еўрапейскіх грамадстваў з-за падтрымкі правоў чалавека.



Характарнымі для прапаганды прыёмамі адзначыліся многія праўладныя медыя: паняткі ЛГБТК+ выкарыстоўваць толькі ў спалучэнні з негатыўна афарбаванымі прыметнікамі, а таксама спрабаваць укараніць у свядомасць, што ЛГБТК+ – гэта не прыроджаныя ўласцівасці чалавека, а навязанае ўспрыманне свету.

Напрыклад: «агрэсіўная ЛГБТ-палітыка пранікае ў свядомасць дзяцей», «Глаз пра сучасныя каштоўнасці Еўропы і ЛГБТ: гэта пачатак канца ўсяго чалавечага», «Ну, і як жа без гей-парадаў? У апошнія два гады кавід злёгку прытармазіў гэтае сатанінства ва ўсеагульным аглядanні».

Цікавая з'ява беларускага медыяполя трэцяга квартала 2022 года – Вольга Бондарава, так званая актывістка з Гродна.

Яе актыўнасць у спробах барацьбы з ЛГБТК+ заўважылі дзяржаўныя і незалежныя медыя. Бачна, што гэтая грамадзянка вырашыла прымерыць на сябе ролю галоўнай захавальніцы «традыцыйных каштоўнасцяў».

Спосабы і прыёмы для гэтага абраныя Вольгай Бондаравай, мякка кажучы, дзіўныя.

Давайце звернемся да некаторых загалоўкаў, якія паведамляюць пра яе «барацьбу»: «Актывістка з Гродна вырашыла змагацца з паветранымі змеямі ў колерах вясёлкі. На яе думку, гэта – ЛГБТ-сімволіка», «Актывістка Бондарава спрабавала адмяніць канцэрты Кіркорава ў Беларусі, але штосьці пайшло не так».

Гэтая адыёзная грамадзянка завяла і свой Telegram-канал, у якім каля 500 падпісчыкаў. У ім яна выкарыстоўвае мову варожасці і прамыя абразы як асноўны tone of voice. Скаргі на кантэнт канала паступаюць рэгулярна. Мы будзем адсочваць актыўнасць Вольгі Бондаравай у беларускім медыяполі.

Не можа не радаваць наяўнасць матэрыялаў, якія распавядаюць пра ЛГБТК+ з аб'ектыўных і ўзважаных пазіцыяў. Так, доктар Юдзіцкі, беларускі псіхіятр, псіхатэрапеўт, адзначае: «Гомасексуальнасць (як і гетэрасексуальнасць, і бісексуальнасць) – гэта разнавіднасць нормы, а не хвароба».

Пры складанні дайджэста мы знайшлі і навінку – рэкламу ЛГБТ-фрэндлі псіхолага ў Мінску.

Спадзяемся, што здаровая пазіцыя па ЛГБТК+ усё часцей будзе прабівацца ў беларускіх медыя..

*Рэдакцыя GPress.info*

vectonauta




# Памятаеце, у OZ прыбралі «ЛГБТ-кнігі»? Аказалася, іх забараніў Гродзенскі гарвыканкам

У Гродзенскім гарвыканкаме правялі прафілактычную гутарку з загадчыкам крамай «OZ кнігі» ў гандлёва-забаўляльным цэнтры Triniti і кіраўніцтвам ГЗЦ.

Нараду ў Гродзенскім гарвыканкаме сабралі пасля звароту актывісткі Вольгі Бондаравай.

На зварот Вольгі адказала намеснік старшыні гарвыканкама Зоя Кулеша. Яна паведаміла, што «кнігі ЛГБТ-тэматыкі» знятыя з продажу ў крамах «OZ кнігі», і падзякавала за «праяўленую грамадзянскую пазіцыю і своечасовае інфармаванне органаў мясцовай улады для прыняцця мераў рэагавання».

https://ru.hrodna.life/2022/07/05/knigi-zapretil-gorispolkom/




# Актывістка Бондарава спрабавала адмяніць канцэрты Кіркорава ў Беларусі, але штосьці пайшло не так

Бондарава сабрала падпісы для адмены канцэртаў спевака і звярнулася ў Мінгарвыканкам. У звароце яна запатрабавала не толькі адмяніць выступленні, але і правесці расследаванне «ў абуральнай сітуацыі, калі чыноўнікі даюць дазвол на выступленне артыста з адназначна антыдзяржаўнай і адкрыта пранацысцкай пазіцыяй, які прапагандуе ЛГБТ і іншыя паскудствы », і пакараць вінаватых.

https://reform.by/323241-aktivistka-bondareva-pytalas-otmenit-koncerty-kirkorova-v-belarusi-no-chto-to-poshlo-ne-tak

GP
gpress.info




# Драгун пакрыўдзіўся, Капскі – закладнік, называць з-за мяжы беларусаў рабамі – агідна. Былы голас «Барысаў-Арэны» – пра тое, як у яго жыцці не засталося белфутбола

– Прапаганда яшчэ любіць казаць, што на Захадзе ўсе разбэшчаныя, і фіксуецца на тэме нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі.

– Напэўна, людзі такім чынам спрабуюць замацаваць за сабой ролю нейкіх экспертаў і дабіцца даверу сярод тых, хто думае дакладна гэтак жа. Што геі – гэта кепска, лесбіянкі – гэта кепска, а нашыя дзеці, калі ўбачаць прадстаўнікоў ЛГБТ, абавязкова пабягуць цалавацца з аднагодкамі свайго полу. Ну і яшчэ адзін матыў такіх выступленняў, як я ўжо сказаў, – проста трэба штосьці казаць.

https://athletes.by/dragyn-obidelsia-kapskii-zalojnik-nazyvat-iz-za-granicy-belarysov-rabami-otvratitelno-byvshii-golos-borisov-areny-o-tom-kak-v-ego-jizni-ne-ostalos-belfytb.html



## *Актывістка з Гродна вырашыла змагацца з паветранымі змеямі ў колерах вясёлкі. На яе думку, гэта – ЛГБТ-сімволіка*

Вольга Бондарава з Гродна ўбачыла ў краме «FUNtastik» у ГЗК «Triniti» паветраных змеяў з адзінарогамі ў колерах «ЛГБТ-вясёлкі».
Яна паскардзілася на цацку. Паводле яе меркавання, «дэманстрацыя ЛГБТ-сімволікі дзецям пагражае дэмаграфічнай бяспецы нашай краіны, парушае Закон "Аб правах дзіцяці" ў частцы абароны дзяцей ад інфармацыі, якая можа прынесці шкоду іх нармальнаму маральнаму развіццю, і Канстытуцыю РБ». У краме толькі ад Вольгі і даведаліся, што, аказваецца, дэманструюць ЛГБТ.

https://ru.hrodna.life/2022/08/31/lgbt-zmei/



## *«Аддасць армію на вайну – сам застанецца з голай жопай». Апальны дзюдаіст – пра ватны патрыятызм Лукашэнкі, стомленасць беларусаў і ЛГБТ у Германіі*

33-гадовы Дзмітрый Шэршань – адзін з найлепшых дзюдаістаў Беларусі, удзельнік ОІ-2016, шматразовы прызёр міжнародных топ-турніраў:

«Як па мне, гэта звычайная праца дэбільнай прапаганды ў Беларусі – казаць, што на Захадзе адны геі і лесбіянкі.

Мне здаецца, калі ты паводзіш сябе не напаказ, калі сваімі паводзінамі нікога не правакуеш, не парушаеш закон, тады ніхто цябе пераследаваць не будзе. Але ўсё роўна прапаганда не, не ды і пачне ў чарговы раз казаць, што на Захадзе паўсюль геі і лесбіянкі. Навошта? Мне здаецца, гэта разлічана на людзей, у якіх замест мазгоў халадзец».

https://by.tribuna.com/tribuna/blogs/editors/3064951.html

### *У Мінску прайшоў трэнінг па пытаннях гарманальнай змены полу*

Ва ўтульнай івэнт-прасторы «Батанік» сабраліся прадстаўнікі беларускай транс* супольнасці, а таксама супрацоўнікі «Адаптацыі» і РМГА «Сустрэча». Вядучай трэнінгу выступіла Ала Шапялькевіч – прафесар кафедры эндакрыналогіі Беларускага дзяржаўнага медычнага ўніверсітэта, доктар медычных навук, старшыня БГМА «Эндакрыналогія і метабалізм». Ала Пятроўна – адзін з самых вядомых і дасведчаных спецыялістаў у трансгендарнай праблематыцы ў нашай краіне, яна працуе ў гэтай галіне ўжо 20 гадоў.

https://www.vstrecha.by/novosti/novosti-organizatsii/3060-v-minske-proshel-trening-po-voprosam-gormonalnoj-smeny-pola.html

## *ЛГБТ-ідэалогія і гомасексуальная прапаганда*

Доктар Юдзіцкі, беларускі псіхіятр, псіхатэрапеўт:

***«Арыентацыя чалавека, яго сексуальная ідэнтычнасць (як ён сябе вызначае) і сексуальныя паводзіны (тое, што ён робіць) – скрайне складаныя з'явы, якім прысвечаны тысячы навуковых публікацыяў, і да гэтага часу яны вывучаныя не да канца. У чым сыходзяцца даследнікі – дык гэта ў тым, што гомасексуальнасць (як і гетэрасексуальнасць, і бісексуальнасць) – гэта разнавіднасць нормы, а не хвароба. Менавіта таму яе нельга «вылечыць», бо не лечаць жа гетэрасексуальных людзей у надзеі змяніць іх арыентацыю».***

https://yudik.org/category/seks/gomoseksualizm/

## *Хроніка пераследу 2 верасня*

Менскі гарадзкі суд вынес прысуд Віталю Рогачу. Яго абвінавацілі ў арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак (ч. 1 арт. 342), распальванні расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці (ч. 1 арт. 130) і абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 Крымінальнага кодэкса).

Таксама мужчыну прымусілі сказаць, што ён з'яўляецца прыхільнікам ЛГБТ-супольнасці і «абяцае выправіцца».

https://www.svaboda.org/a/32015474.html

## *ЛГБТ-фрэндлі псіхолаг у Мінску*

Дар'я Іванова

ГЕШТАЛЬТ-ТЭРАПЕЎТ, ПРАЦУЮ З КРЫЗІСАМІ І ТРАЎМАМІ, ЛГБТ-ФРЭНДЛІ

https://handshaker.by/catalog/lgbt-frendli-psiholog






## *Найлепшая тэнісістка Расіі асудзіла вайну ва Украіне і зрабіла камінг-аўт: Азаранка цалавала яе ў лоб, беларускі – рэгулярна абыгрывалі*

Першая ракетка Расіі і 12-я ракетка свету Дар'я Касаткіна стала другой за паўтара месяца расійскай спартсменкай, якая адначасова выступіла супраць вайны ва Украіне і зрабіла камінг-аўт. Першаадкрывальніцай стала футбалістка «Эспаньолы» Надзея Карпава.

https://by.tribuna.com/tribuna/blogs/tennis/3062484.html



## *Гетэра-, гома- і бісексуальнасць. Як распавесці правільна?*

Ужо не першы раз у беларускіх пабліках і СМІ з'яўляецца інфармацыя пра тое, што ў краіне наспела неабходнасць змагацца з прапагандай ЛГБТ. Прадстаўнікі царквы адкрыта называюць гомасексуальнасць «палавым вычварэннем». У той жа час у Міжнароднай класіфікацыі хваробаў сексуальная арыентацыя не разглядаецца як разлад.

https://www.ranak.me/2022/08/18/getero-gomo-i-biseksualnost-kak-rasskazat-pravilno/



## *Улады так адцягваюць ад рэальных праблемаў. Як немцы ставяцца да прапаганды ЛГБТ*

Заходняя прапаганда гомасексуалізму і транссексуалізму пераходзіць усе магчымыя межы. Як успрымаюць засілле ЛГБТ самі немцы і што наогул зараз адбываецца ў Германіі, «Мінскай праўдзе» распавяла жыхарка Магдэбурга.

https://mlyn.by/27072022/vlasti-tak-otvlekayut-ot-realnyh-problem-kak-nemczy-otnosyatsya-k-propagande-lgbt/

## *Пётр Пятроўскі: «Асаблівасцю заходняй цывілізацыі з'яўляецца нейкі фанатызм у многіх рысах»*

Кірыл Казакоў:
***«У мяне глупае пытанне: у мяне такое ўражанне складаецца, што геі там карыстаюцца большымі правамі, чым рускія».***

Пётр Пятроўскі:
***«Так, яны карыстаюцца большымі правамі, чым гетэрасексуалы, як кажуць модна. То бок калі ты белы цысгендарны мужчына, то ты ўжо ўшчэмлены, таму што ты такі. А калі ты трансгендар, метыс, які нідзе ніколі не працуе, то ты з'яўляешся прывілеяваным чалавекам. Вось у чым асаблівасць, на жаль, сучаснай заходняй цывілізацыі».***

https://ctv.by/pyotr-petrovskiy-osobennostyu-zapadnoy-civilizacii-yavlyaetsya-kakoy-fanatizm-vo-mnogih-chertah



## *Вечная таямніца Барыса Маісеева. Кім на самай справе быў «кароль эпатажу»?*

«Што там яшчэ ўчыніў Маісееў?» – хвалявалася публіка. «Выгнаць блюзнера і разбэшчвальніка!» – патрабавалі прыхільнікі асноў. А Барыс меў асалоду ад таго, што адбывалася, не забываючы правакаваць: «Шчыра ваш Борачка Маісееў – такі ж, як вы».

Напэўна, першымі ўзбунтаваліся расійскія ЛГБТ-актывісты, якія ўсклікнулі: Маісееў несапраўдны! І тое верна, ён не выступаў з палітычнымі заявамі, не патрабаваў «вясёлкавых» парадаў і іншых падобных прагрэсіўных рэчаў.

https://aif.by/timefree/stars/vechnaya_tayna_borisa_moiseeva_kem_na_samom_dele_byl_korol_epatazha

## *«Такой літаратуры быць не павінна». Ці ёсць цэнзура ў беларускім кнігавыданні? Меркаванне дэпутата*

Сяргей Клішэвіч, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі:
***«...Калі, напрыклад, гэтая літаратура прапагандуе ЛГБТ, калі гэтая літаратура праслаўляе сёння здраднікаў і памагатых нацыстаў...»***

Юлія Бяшанава: ***«Такія кнігі таксама бачылі на прылаўках?»***

Сяргей Клішэвіч: ***«Вядома. Няма розніцы, якой формы ўласнасці гэтая крама – такой літаратуры быць не павінна. Зразумела, цэнзура ў XXI стагоддзі проста немагчымая, таму што ёсць інтэрнэт».***





## *«У Германіі моладзь расце без павагі да бацькоў і любові да сваёй Радзімы». Чаму шматдзетная сям'я з Германіі выбрала Беларусь краінай для жыцця*

Яшчэ бацькоў непакоіў той факт, што ў Германіі дзяцей з малодшага ўзросту пераконваюць, што ЛГБТ – гэта нармальна, а вось сямейныя традыцыі і каштоўнасці, наадварот, сціраюцца. Уладзімір і Нэлі супраць такога выхавання, яны хочуць расціць дзяцей, грунтуючыся на традыцыйных каштоўнасцях. На тых, што і самі выраслі.

https://grodnonews.by/news/zhizn/v_germanii_molodezh_rastet_bez_uvazheniya_k_roditelyam_i_lyubvi_k_svoey_rodine_pochemu_mnogodetnaya_semya_iz_germanii_vybrala_belarus_stranoy_dlya_zhi.html



## ЗАХАДня і яе замова: Чаго нам чакаць ад МКХ-11, які няўмольна насоўваецца, ці Як усё перавернута з ног на галаву

У сувязі з тым, што транссексуальнасць хочуць падаць як норму, узнікае цалкам заканамерная ўвага да існуючай у цяперашні час практыкі бясполага (гендарна-нейтральнага) выхавання, якое грунтуецца на гендарным мэйнстрымінгу.

На думку тэарэтыка «гендару», дзяцей належыць першапачаткова выхоўваць бясполымі, а ў далейшым яны самі вырашаць, кім ім быць, мужчынамі ці жанчынамі, а можа быць і прадстаўнікамі іншага гендару. Гэта можа прывесці да фарміравання розных скажэнняў гендарнай ідэнтыфікацыі, уключаючы трансгендарызм.

https://vecherniy-mogilev.by/zapadnya-i-ee-zakaz-chego-nam-zhdat-ot-neumolimo-nadvigajushhegosya-mkb-11-ili-kak-vse-perevernuto-s-nog-na-golovu/



## ЗАХАДня: «Горад спіць. Прачынаецца мафія...», дакладней – гендарызм!

На працягу многіх гадоў патрыёты Беларусі адсочваюць і, выкарыстоўваючы законныя сродкі, спрабуюць прыцягнуць увагу ўладаў да неабходнасці ўтаймавання агрэсіўнага заходняга лобі, якое навязвае нашаму народу гендарныя свабоды. Не будзем пералічваць усе перыпетыі гэтага нялёгкага шляху, на якім перамогі і паражэнні змяняюць адно аднога. Адной з акцыяў патрыётаў быў збор пяцідзесяці дзвюх тысяч подпісаў супраць прапаганды ЛГБТ сярод непаўнагадовых. Рашэнне гэтага пытання адклалі на нявызначаны час…

https://vecherniy-mogilev.by/zapadnya-gorod-spit-prosypaetsya-mafiya-tochnee-genderizm/

## Асцярожна, сарказм! Планета без малпаў ці навошта вырашылі адмяніць прыматаў

Камісар аховы здароўя Ашвін Васан запатрабаваў от Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) перайменаваць воспу малпаў. Маўляў, цяперашняя назва зневажае геяў і неграў; маўляў, «малпіна» тэрміналогія ўкаранілася ў гісторыі як расісцкая, якая зневажае найлепшыя пачуцці ЛГБТ і чорнаскурых. Прычым, пачуцці ЛГБТ – больш.

Дзеля геяў і неграў СААЗ заўжды гатовы расстарацца.

https://mlyn.by/02082022/ostorozhno-sarkazm-planeta-bez-obezyan-ili-zachem-reshili-otmenit-primatov/

## Глаз пра сучасныя каштоўнасці Еўропы і ЛГБТ: гэта пачатак канца ўсяго чалавечага

Старшыня Магілёўскай абласной ветэранскай арганізацыі Анатоль Глаз:

***– Для Захаду гэта пачатак канца ўсяго: сацыяльнага, эканамічнага і перш за ўсё, я не баюся гэтага слова, чалавечага. Яны ж хочуць сёння нас паказаць, што мы ненармальныя, а яны са сваімі ЛГБТ і ўсім астатнім – бацька адзін і два – гэта яны нармальныя. А мы з вамі ненармальныя. То бок яны пайшлі супраць прыроды як такой, прыроды чалавечай сутнасці, а яна не прабачае такія рэчы.***

https://www.belta.by/world/view/glaz-o-sovremennyh-tsennostjah-evropy-i-lgbt-eto-nachalo-kontsa-vsego-chelovecheskogo-524426-2022/



## У Мінску пачаўся разгляд крымінальнай справы ў адносінах стваральнікаў і ўдзельнікаў дзіцячай порнастудыі

Прыкрываючыся прыгожым словам «талерантнасць», свет даўно пераступіў тую мяжу, за якой практычна любое злачынства стала апраўдвацца правам кожнага жыць так, як яму хочацца.

Гэта прырода ва ўсім вінавата: яшчэ ва ўлонні маці заклала ў чалавеку пэўныя перавагі. У еўропах-амерыках гэта ўжо разумеюць. Тым больш у іх ёсць багаты досвед «разумення», што геі-лесбіянкі і іншыя гендарныяперакосы – гэта таксама прырода. Па тым жа шляху ідуць і педафілы: акуратна ўкараняюць у свядомасць грамадства, што і тут прырода ва ўсім вінаватая, шкадаваць іх трэба, і наогул, не такія ўжо яны кепскія. Дзяцей вось любяць. Як ім прырода падказвае, вядома, але любяць жа…

https://www.sb.by/articles/bezopasnost-detey-otvetstvennost-vzroslykh.html




## Пра важнасць традыцыйных каштоўнасцяў гаварылі на славянскім форуме сем'яў

Бачым, як агрэсіўная ЛГБТ-палітыка пранікае ў свядомасць дзяцей. Хлопчыкі выглядаюць як дзяўчынкі, а дзяўчынкі як хлопчыкі…

Толькі сумесныя намаганні дазволяць спыніць негатыўныя тэндэнцыі і разбурэнне сямейных каштоўнасцяў грамадства. Старшыня праўлення Дабрачыннага фонду «Пакроў» Андрэй Зубенка падкрэсліў, што зараз у Саюза Беларусі і Расіі ёсць унікальная магчымасць аб'яднаць намаганні ў дасягненні гэтай мэты.

https://volkovysknews.by/sotsium/31175-o-vazhnosti-traditsionnykh-tsennostej-govorili-na-slavyanskom-forume-semej

## Рэакцыі рэдакцыі: духоўнасць і маральнасць у люстраным адбітку

Ну, і як жа без гей-парадаў? у апошнія два гады кавід злёгку прытармазіў гэтае сатанінства ва ўсеагульным аглядванні. Размах быў не той, але ружова-блакітныя святы, падобна, невынішчальныя. У гэтай сувязі ўзгадваецца лета 2000 года, калі беларускі турыстычны аўтобус захрас у корку перад Брандэнбурскай брамай. Замест экскурсіі мы вымушаныя былі глядзець з вокнаў аўтобуса на першы ў Берліне гей-парад. Улады горада паслужліва перакрылі цэнтр горада, каб прадстаўнікі ЛГБТ-супольнасці змаглі ў поўнай меры прадэманстраваць свае «маральныя» каштоўнасці. А ў аўтобусе, між іншым, былі дзеці, якія ад небывалага відовішча пацалункаў мужчынскіх асобінаў у бальных сукенках і панчохах пачалі задаваць пытанні, якія прыводзілі бацькоў у маральны ступар. Ну, як ім патлумачыш, што знак роўнасці паміж усеагульнымі і агульначалавечымі канонамі духоўнасці і маральнасці па розныя бакі мяжы ставіць нельга.

https://newsgomel.by/news/mneniya/reaktsii-redaktsii-dukhovnost-i-nravstvennost-v-zerkalnom-otrazhenii_80899.html

# Запрашаем на Gay Press

***https://gpress.info***

YouTube

Instagram

TikTok

ВКонтакте

Telegram

Яндекс.Дзен

Facebook

Twitter

E-mail: gaypresseu@gmail.com

gpress.info